(кальцавая кампазіцыя, «двайнік», значная ўвага да часу). Пры гэтым рэалістычная паглыбленасць праяўляецца праз кантрасныя спалучэнні і экзістэнцыйную завостранасць сітуацыі выбару паміж жыццём і смерцю не толькі сваімі, але і чужымі. Герой, хоць і адчувае прагу да жыцця, аказваецца гатовым да ахвяравання сабой дзеля шчасця іншых, што паглыбляе антываенную скіраванасць апавядання.

## Літаратура


1. *Быкаў, В.* Збор твораў : у 4 т. / В. Быкаў. – Мінск : Маст. літ., 1980–1982. – Т. 1 : Аповесці. – 1980. – 432 с.
2. *Быкаў, В.* Збор твораў : у 4 т. / В. Быкаў. – Мінск : Маст. літ., 1980–1982. – Т. 4 : Аповесці і апавяданні. – 1982. – 479 с.


*А. С. Кавалюк (Беларусь)*

# ДУХОЎНЫ СВЕТ ЛІРЫЧНАГА ГЕРОЯ, ПАЭТЫКА ТРАГІЧНАГА І САКРАЛЬНА-ГУМАНІСТЫЧНАГА Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ 1940–1950-Х ГАДОЎ

Савецкая ідэалогія не спрыяла духоўнаму развіццю чалавека, яго самапазнанню і самавыражэнню. Усе намаганні ідэолагаў былі пакладзены на фарміраванне камуністычнай маралі, гіпертрафіраванага патрыятызму і грамадзянскасці з прыярытэтам грамадскага над асабістым. У рэчышчы такіх установак вымушана было развівацца мастацтва слова. У гісторыі беларускай літаратуры пасляваеннае дзесяцігоддзе аказалася найслабейшым у творчым плане ў параўнанні з іншымі перыядамі. Аднак былі мастакі слова, у творчасці якіх і ў гэты час выяўляўся духоўны свет асобы. Гэта М. Сяднёў, Н. Арсеннева, А. Салавей, К. Кірэенка, Максім Танк.

Асэнсоўваючы паэзію перыяду Вялікай Айчыннай вайны, літаратуразнаўца Г. Тварановіч звярнула ўвагу на з’яўленне ў тагачаснай літаратуры твораў біблейскай тэматыкі, зваротаў да Усявышняга («Малітва» Н. Арсенневай, «Хрыстосаў лёс» А. Салаўя). Даследчыцай натуральна ўспрымалася, што «ў цяжкія часы выпрабаванняў праз абвостраны духоўны пошук адбывалася атаясамліванне лёсу чалавека, Радзімы з гісторыяй хрысціянства як жыццядайнай маральна-этычнай апорай, дадзенай чалавецтву» [5, с. 29]. У параўнанні са З. Астапенкам, які «аказаўся на своеасаблівых светапоглядных ростанях», Н. Арсеннева і А. Салавей бачыліся Г. Тварановіч «больш паслядоўнымі, згарманізаванымі з вечным сэнсам, агульначалавечымі каштоўнасцямі» [5, с. 30].

Супастаўляючы паэзію Н. Арсенневай і А. Куляшова ваеннага часу, А. Петрашкевіч выказала думку, што «магутны талент Аркадзя Куляшова быў кінуты на алтар «новай веры», у аснове якой – адмаўленне не толькі рэлігіі, веры, але і агульначалавечых каштоўнасцяў. Гэтак дасканала адшліфаваныя, сапраўды «стальныя» радкі з верша «Камуністы» і ёсць праўдзівым сімвалам гэтай «новай веры»: «Мы не верым ані ў бога, ні ў малітвы, / І няма для нас другіх свяцейшых слоў…»

Наталля Арсеннева свой талент у тым страшным часе скіравала на іншае: стварыла непераўзыдзеную па сіле ўздзеяння, глыбокім патрыятызме велічную «Малітву»« [3, с. 150]. Так даследчыкамі творчасць савецкіх мастакоў слова супрацьпастаўлялася творчасці пісьменнікаў-эмігрантаў, якія, па волі лёсу, аказаліся больш вольнымі ў самавыяўленні.

Разглядаючы нацыянальную літаратуру пасляваеннага дзесяцігоддзя, А. Яскевіч вылучыў асаблівыя «сваёй агульначалавечай танальнасцю» творы К. Кірэенкі і Максіма Танка. Па меркаванні даследчыка, у паэзіі першага з іх «самыя пранікілівыя сілавыя лініі паэтавага светабачання снуюцца з трансцэндэнтнай повязі чалавека з прыродай, калі ў найлепшыя яго духоўныя станы яна дакранаецца ўсім сваім сусветным шматгалоссем. <…> Паэзія К. Кірэенкі заварожвае танчэйшым імпрэсіянізмам патаемных змен прыродных явішчаў» [6, с. 49]. Прыродазнаўчую лірыку гэтага паэта літаратуразнаўца адносіць да адкрыцця пасляваеннай паэзіяй «новых спектраў светабачання».

Даволі наватарскім для тагачаснай літаратуры падаецца верш К. Кірэенкі «Роздум» (1955), які пачынаецца ўспамінам лірычнага героя аб трагічных лёсах бацькі і брата з сястрой – ахвяраў вайны. Боль і гнеў перапаўняюць сэрца героя і нараджаюць нянавісць да Нямеччыны. Ён задумваецца, *«як абыйсціся з краінаю гэтай, / Спапяліўшай / І скатаваўшай паўсвета?»* [2, с. 58]. Аднак ненавісная краіна сустрэла салдата-вызваліцеля сваёй трагедыяй: ён убачыў немцаў-вязняў і сірот. Таму і не здолеў зрабіць *«апроч ворагаў крыўды нікому»*. Яго гуманістычную пазіцыю адабрае маці: *«Будзь, сынок, як і быў Чалавекам…»* Лірычны герой К. Кірэенкі *«з жыццём усім <…> навечна ў згодзе»*, гатовы пакланіцца ўсяму беламу свету, яму хочацца *«пакланіцца прыродзе»*. Паэт і яго герой перакананы, што патрэбна *«несці скарбы ў жыццё, каб іх мець у жыцці…»* [2, с. 58].

А. Яскевіч заўважыў, што паэзія Максіма Танка ў пасляваенны час увабрала многае ад народнай эстэтыкі, у сваіх вершах мастак слова «ўзбуйняў жыццёвую канкрэтыку ў расквечаны, абагулена цэласны нацыянальны космас. <…> З гэтай дзівоснай антрапамарфізацыі і інтравертнасці становішчаў, дзе паэт нароўні, у сваяцкім панібрацтве з усім наваколлем, нябачна, здаецца, толькі асацыятыўным дотыкам снуецца вобразная тканіна танкаўскага верша» [6, с. 52–53].

У паэзіі Максіма Танка пасляваеннага перыяду, у параўнанні з іншымі паэтамі-сучаснікамі, шмат вершаў інтымнай лірыкі («Няма сцежкі карацейшай», «Прызнанне», «Сварка», «Я знаю яе» і інш.). Паэт свядома засяроджваўся на выяўленні душэўных працэсаў (адчуванняў, успрыманняў, эмоцый, пачуццяў) асобы і неабходнасці іх наяўнасці для гарманічнага жыцця. У вершы «Ave Maria», перадаўшы

зрухі ў душы лірычнага героя, Максім Танк паспрабаваў узняцца да асэнсавання духоўнай сферы, аднак гэтая спроба засталася нерэалізаванай. Героя паланіла фізічная прыгажосць маладой манашкі і не дазволіла яму адчуць і ўспрыняць высокі духоўны ўзровень сямнаццацігадовай асобы, якая ў атэістычны савецкі час *«глядзіць набожна на крыж»*.

Пры выяўленні духоўнага свету лірычнага героя беларускай паэзіі 1940–1950-х гадоў звяртае на сябе ўвагу паэтыка трагічнага і сакральна-гуманістычнага. Першая палова стагоддзя была перапоўнена трагедыйнымі падзеямі (рэвалюцыі, войны, таталітарызм), якія, паставіўшы чалавека ў экстрэмальныя сітуацыі, рабілі яго ахвярай абставін. Беларуская літаратура выявіла трагізм асобы, выкліканы не ўласнымі яе памылкамі, а супярэчнасцямі звонку.

Трагічнае і сакральна-гуманістычнае займаюць значнае месца ў творчасці 1940–1950-х гадоў паэтаў-эмігрантаў. Зборнік М. Сяднёва «Ля ціхай брамы» (Нью-Ёрк, 1955) пачынаецца радком *«Баюся тых дарог, што я прайшоў аднойчы…»* [4, с. 5]. Аўтабіяграфічны герой адчувае сябе адным у свеце, выгнаным у чужыну («Сум»). Аднак адзінота сярод людзей наблізіла яго да Бога. *«З мальбою ціхай, пяшчотнаю, дзіцячай, што шэпчуць <…> вусны уначы»* [4, с. 19], ён просіць не толькі за сябе, але і за іншых. Ад жыццёвых нягод герой захінаецца, *«як на марозе, прастудзіць баючыся душу»*. Ён прызнаецца: *«Прыглядаюся, каб не разбіцца, / вобмацкам хаджу я, спакваля <…> падае з-пад ног маіх зямля…»* Лірычны герой М. Сяднёва здольны адчуваць велічную Боскую сілу, праяўленую ў прыродзе, супастаўляць ёй *«грэшныя ў непаслушэнстве душы»*. Тонкае ўспрыманне Боскага, *«ціхай таемнасці Бога»* ўласціва і герою верша «Смерць малітваў». Хрысціянскае светаўспрыманне лірычнага героя, *«адзіным словам»* якога *«на этапах далёкіх»* было *«… і ныне й прысна…»* выяўлена ў вершы «Патрыёты». Ён здольны ў неспрыяльных для таго абставінах (*«пад карканне варон»*) шаптаць ціхутка малітву. У сваім маленні паядноўвае асабіста-побытавае, грамадскае і вечнае, спадзеючыся на Боскае блаславенне: *«Каб пры канцы шляхоў маіх далёкіх, / <…> ня помнячы грахоў і крыўдаў лёгкіх, / прыхільныя багі мяне багаславілі»* [4, с. 30]. Герой М. Сяднёва задаецца філасофскімі пытаннямі, хацеў бы ведаць *«перад канцом, які пачатак за канцом наступіць? / Ці смерць, нарэшце, азначае смерць, / ці мо' па смерці ёсць яшчэ што-небудзь?»* [4, с. 46]. Ён гатовы паверыць *«у тое, чаго, магчыма, і … няма»*, але не гатовы да адыходу ў Вечнасць, прызнаецца, што калі б яму было дадзена *«пражыць яшчэ адно жыццё»*, ішоў бы толькі Боскімі дарогамі і быў бы больш дастойны («Смерць музыкі»). У вершы «Адкуль-жа будзе…» [4, с. 43] ёсць разважанне аб грахоўнасці чалавечага існавання, дзе мае месца гардыня. Паэт перакананы, што *«маленькае»*, але *«зласлівае і зайздроснае Я»* не дазваляе нарадзіцца ў чалавечай душы любові, спагадзе і замілаванню.

Адной з вышэйшых ступеняў праяўлення духоўнасці з'яўляецца здольнасць чалавека быць удзячным Усявышняму за ўсё, што пасылае. На вуснах лірычнага героя М. Сяднёва – *«Хвала Табе і ўсенькаму Твайму тварэньню!»* [4, с. 47]. Баючыся не паспець зрабіць самае важнае, ён прамаўляе: *«Божа мой… Яшчэ я пра Цябе як трэба й не падумаў…»* [4, с. 48].

Свой духоўны шлях праходзіць лірычная гераіня Н. Арсенневай. У час вайны, атрымаўшы, як ёй здавалася, магчымасць служыць справе адраджэння Айчыны, яна *«гатова гарэць на ветры за краіну»* («Вось толькі выпішуся трохі»). Яна верыць у мажлівасць жыць у краіне на зайздрасць суседзям, якраз у гэты час стварае «нераўзыдзеную па сіле ўздзеяння, глыбокім патрыятызме велічную «Малітву»« (А. Петрушкевіч). У вершы «Варта жыць» Н. Арсеннева канстатуе: *«Кожны з нас яшчэ верыць у нешта святое: / хто ў Хрыста, / хто ў Край, / а хто – проста ў сябе»* [1, с. 140]. Верш «Характво» сведчыць, што ў 1943 годзе ў свядомасці паэткі і яе лірычнай гераіні адбываецца пэўнае празарэнне, вера ў адраджэнне нацыі губляецца, назіраецца трагізм светаўспрымання. Ён выяўлены ў бязрадасным пейзажы (*«Лякам рожавым апырскаў неба вечар…»*), які выклікае адпаведны душэўны стан. Ідучы з *«паніклай галавой»*, лірычная гераіня адчувае *«столькі едкае бязглуздзіцы наўкола, / столькі тайніцаў / пякучых і гаркіх, / што нат сорамна вышэй узняць нам голаў… <…> Душыць, душыць нас смугой слізкой і клейкай /задаўнёны жаль, / а лепшага не чуць…»* [1, с. 130]. *«Гібее ў смутку»* яе душа, *«не бачыць суцехі»* і ў вершах, напісаных па прыездзе ў Берлін (*«Я суцяшаю не іншых – сябе»*). Трагізм эміграннцкага існавання выяўлены ў вобразе смерці, *«што сочыць, як той ганчак, <…> сляды і сцені»*, а ў выніку – *«шмат хто ўжо зачах»*. Дзве сілы палоняць душу Н. Арсенневай у эміграцыі: туга і вера ў Беларусь. Трагічная выява Бацькаўшчыны створана паэткай праз вобразы *«сплаканых горка бяроз»*, патаптанай у снег бяды, чорнага дыму ў папялішчах («Там»), праз вобраз шляхоў, *«парослых злой травой»*, *«апырсканых крывёй»* («Не плачце»), *«распятага ворагам, шматпакутнага краю <…> дзе тырчаць з папялішча ў неба каміны, <…> па шляху, па лужынах, / босыя, ў лапцёх, / моўчкі сцені сунуцца, / кленучы жыццё. <…> Як ваўкоў, вартуюць іх / колкія штыкі»* («Бацькаўшчыне») [1, с. 157]. Трагічнае і сакральна-гуманістычнае паяднаны ў вершы Н. Арсенневай «Ускрэсні!» Як ва ўваскрашэнне Хрыстова верыць паэтка ва ўваскрашэнне свайго Краю.

Творчасць Н. Арсенневай і М. Сяднёва 1940–1950-х гадоў ва ўмовах эміграцыі сведчыць пра тое, што знаходжанне па-за савецкай цэнзурай спрыяла творчаму самавыяўленню паэтаў-эмігрантаў, не абмяжоўвала іх у спасціжэнні духоўнага свету чалавека. У савецкай літаратуры дадзенага перыяду на гэта аказаліся здольнымі адзінкі.

## Літаратура


1. *Арсеннева, Н.* Яшчэ адна вясна : выбр. творы / Н. Арсеннева ; уклад. і прадм. А. Сямёнавай. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 271 с.
2. *Кірэенка, К.* Збор твораў : у 3 т. / К. Кірэенка. – Мінск : Маст. літ., 1986. – Т. 1 : Вершы, паэмы 1939–1962. – 494 с.
3. *Петрушкевіч, А.* Паэзія Наталлі Арсенневай і Аркадзя Куляшова ваеннага часу / А. Петрушкевіч // Наталля Арсеннева: шлях да Беларусі / А. Петрушкевіч ; прадм. і рэд. А. М. Пяткевіча. – Мінск, 2013. – С. 144–153.
4. *Сяднеў, М. Ля* ціхай брамы : вершы / М. Сяднеў. – Нью-Ёрк,1955. – 64 с.

5. *Тварановіч, Г.* Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны / Г. Тварановіч // Гісторыя беларускай літаратуры XX ст. : у 4 т. – 2-е выд. – Мінск, 1999–2014. – Т. 3. – 2002. – С. 8–40.
6. *Яскевіч, А.* Паэзія першага пасляваеннага дзесяцігоддзя / А. Яскевіч // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – 2-е выд. – Мінск, 2001–2014. – Т. 3. – 2002. – С. 55–80.

*Г. В. Кажамякін (Беларусь)*

# ПЕРШЫ ЗБОРНІК МАКСІМА ТАНКА «НА ЭТАПАХ» (1936)

У 1920-я – 1930-я гады, калі Заходняя Беларусь фактычна з 1919 г., а юрыдычна – з 1921 г. (паводле Рыжскай дамовы) знаходзілася ў складзе Польшчы, прадстаўнікі беларускіх нацыянальных рухаў, палітычных партый вялі дзейнасць, скіраваную на захаванне свайго народа як нацыі, выступалі супраць гвалтоўнай паланізацыі. Абставіны, характар такога дзеяння тагачасных уладаў гэтай краіны былі апісаныя, напрыклад, у рамане Вячаслава Адамчыка «Чужая бацькаўшчына». Беларускі нацыянальны рух знаходзіўся пад пільным наглядам спецслужбаў. Рэпрэсіі кранулі і тых, хто змагаўся за далучэнне да БССР заходніх беларускіх земляў або выступаў за стварэнне самастойнай заходнебеларускай дзяржавы. Шэраг вядомых дзеячоў прайшлі праз турмы: гэта й Браніслаў Тарашкевіч, і Сяргей Прытыцкі, і Валянцін Таўлай… Яшчэ ў 1923 г. быў арыштаваны, асуджаны да расстрэлу пісьменнік, выдавец, навуковец Максім Гарэцкі, але пазней смяротная кара была для яго адмененая: спачатку выслалі ў Дзвінск, пазней – у Савецкую Беларусь… Кранула падобнае і паэта Заходняй Беларусі Максіма Танка, які вёў беларускую патрыятычную працу, прапагандаваў беларускую мову насуперак культурнай асіміляцыі беларусаў, з якіх шмат хто перапісваў сваю нацыянальнасць як паляк.

Мы звернемся да першага перыяду літаратурнай і грамадскай дзейнасці Максіма Танка ў рамках разгляду гісторыі выдання і гісторыка-культурнага значэння першай паэтычный кнігі.

Свой творчы шлях праз кнігадрук пісьменнік пачаў у 1936 г. з выхаду ў Вільні зборніка вершаў «На этапах». На фронтыспісе – партрэт і факсіміле подпісу аўтара. Паэт жыў тады ў Вільні, якая вызначалася неафіцыйна як фактычны цэнтр Заходняй Беларусі. Як вядома, ранні перыяд яго творчасці звязаны менавіта з гэтым старажытным местам.

Уступны артыкул «Матывы творчасці Максіма Танка» напісаў для зборніка вядомы дзеяч беларускай культуры, фальклярыст, дырыжор, кампазітар, пісьменнік (літаратурная крытыка, публіцыстыка), збіральнік і даследчык беларускіх